ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 03.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 196 (1465) ‖ ПАНЯДЗЕЛАК, 24 чэрвеня 1931 г.

КРЫВАВЫ ТЭРОР ФАШЫСЦКІХ РАЗБОЙНІКАЎ НЯ СТРЫМАЕ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ

Будзем узмацняць інтэрнацыянальную сувязь і дапамогу нашым братом па змаганьню

Адлічваем аднадзённы заработак і выклікаем усіх будаўнікоў БССР

Рабочыя, служачыя і адміністрацыйны пэрсонал Крычаўскага цэмантнага заводу, заслухаўшы інформацыі аб увядзеньні новага турэмнага рэжыму для палітвязьняў у турмах Польшчы, абавязваюцца аказаць ім матэр'яльную дапамогу.

— Рабочыя заводу адлічаюць аднадзённы заработак і выклікаюць усіх будаўнікоў БССР пасьледваць іх прыкладу.

У адказ на белы тэрор рабочыя абавязваюцца закончыць будаўніцтва гіганта—цэмантнага заводу ў тэрмін і ўступіць усім у рады МОПР'у.

— Фашыстым ня ўдасца зламаць рэволюцыйны рух. Белы тэрор не ратуе ад эканамічнага крызісу капіталістычны сьвет.

Няхай жыве МОПР—дапаможнік палітзьняволеным!

Выконваем прамфінплян раней тэрміну

Рабочыя Крычаўскай арцелі краўцоў протэстуюць супроць нячуваных зьверстваў польскага фашызму і ў адказ на гэта абавязваюцца выканаць свой прамфінплян раней тэрміну. На матэр'яльную дапамогу палітзьняволеным рабочыя ўносяць аднадзённы заработак, разгортваюць соцспаборніцтва на добраахвотнае індывідуальнае ахвяраваньне ў фонд дапамогі палітзьняволеным на зімовы час.

Фашызм агнём і мечам хоча зьнішчыць рэволюцыйны рух пролетарыяту, але пад націскам рэволюцыйных рабочых і сялян ён згіне.

Рабочыя арцелі краўцоў уступаюць усе у рады МОПР'у, арганізоўваюць новую мопраўскую ячэйку. Выклікаюць усе арцелі Крычава пасьледваць іх прыкладу.

Выкананьнем задач уборкі маральна падтрымаем сваіх братоў

Міжпрофсаюзны сход Лепельскага р-ну заслухаўшы інформацыю аб крывавым тэроры ў Польшчы у прынятай пастанове заяўляе; „Мы, члены профсаюзаў, рабочыя і служачыя Лепельскага р-ну выносім рэзкі протест супроць нячуваных зьдзекаваньняў лепшых сыноў рабочае клясы і працоўнага сялянства.


— Для маральнага падтрыманьня палітзьняволеных абавязваемся ліквідаваць прарыў ва ўборачнай кампаніі шляхам арганізацыі брыгад і суботнікаў імя МОПР'у на ўборцы лёну. Ніводнага саюзу не павінна быць без ячэйкі МОПРу. Ніводнага члена профсаюзу не павінна быць па-за радамі МОПРу.

Мы працягваем руку дапамогі нашым братом Польшчы і ўносім 1000 руб. Мы разгорнем збор сродкаў на будаўніцтва інтэрнацыянальнага дзіцячага дому ў Іванава-Вазьнясенску.

Далоў фашысцкую дыктатуру!

Няхай жыве Савецкая Польшча!

Працоўныя БССР на дапамогу сваім братом па клясе



У сувязку з кампаніяй протэстаў, на агульных раённых сходах працоўныя БССР высоўваюць сустрэчныя кантрольныя лічбы па кампаніі зімовай дапамогі

Пухавіцкі р-н замест заданьня ЦК МОПР'у БССР 3000 р. абавязваецца сабраць 8000 р., Гомельскі р-н замест заданьня 30000 р. абавязваецца сабраць 35000 р., Барысаўскі р-н замест заданьня 10000 р. абавязваецца сабраць 19000 р., Менскі р-н замест заданьня 40000 р. абавязваецца сабраць 60000 р., Віцебскі р-н замест заданьня 30000 руб. абавязваецца сабраць 35000 р., Чэрыкаўскі раён замест заданьня 1500 руб. абавязваецца сабраць 3000 руб., Лагойскі раён замест заданьня 2000 р. абавязваецца сабраць 4000 руб., Аршанскі раён замест заданьня 12000 руб. абавязваецца сабраць 17000 руб.

* У час кампаніі протэсту, працоўныя Менску на карысьць палітзьняволеных фашысцкай Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны сабралі 12.400 руб.

Сьледваць прыкладу работніцы Бэрнацкай

Комсамольская ячэйка шорнай фабрыкі „Усход“ (Менск) пачала збор сродкаў на дапамогу палітвязьням. Мітынг вынес пастанову адлічыць два проценты месячнага заработку. Другая зьмена пасьледвала прыкладу першай.

Пачаўся збор сродкаў падпісным лістам. Першай адгукнулася работніца Бэрнацкая. Акрамя адлічэньня двух процантаў месячнага заработку, яна ўнесла па падпіснаму лісту 15 руб.

Збор сродкаў працягваецца. Рабочыя выклікаюць на соцспаборніцтва адзін аднаго. На фабрыцы вывешана дошка, дзе адзначаюцца выклікі і узносы грошай. Акрамя адлічэньняў, па падпіснаму лісту сабрана 175 руб.

Э. Зархін.

Кожны рабочы ўносіць у фонд дапамогі палітвязьням

У кожным цэху і групах Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату адбыліся мітынгі протэстаў супроць ўвядзеньня новага рэжыму да палітзьняволеных у турмах фашысцкай Польшчы.

— Рабочыя і служачыя і тэхнічны пэрсонал рашуча протэстуюць супроць нячуваных зьдзекаў над палітзьняволенымі — лепшымі барацьбітамі за Савецкую Польшчу.

У адказ на зьдзекі разьюшаных фашыстых кожны рабочы робіць адлік ад зарплаты ў карысьць палітзьняволеных Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

А. Паходня.

Комсамольскі энтузіязм на вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы

Індустрыялізацыя краіны, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі, будаўніцтва і пуск 518 і 1040, для вырашэньня задачы грамадзкага харчаваньня ў сувязі з ростам гарадоў і рабочае клясы выклікае вялікую патрэбу ў мясе і малацы. Дзеля гэтага нам неабходна як найхутчэй вырашыць мясную проблему.

Мясная проблема, жывёлагадоўля, павінна быць і будзе вырашана спрабаваным партыяй шляхам—шляхам будаўніцтва соцыялістычных фабрык мяса—спэцыялізаваных савгасаў і МТФ і СТФ пры колгасах.

Партыя і ўрад адозваю ЦК Усе КП(б) і СНК СССР і пастановаю ЦК КП(б) і СНК БССР, конкрэтызаванаю для ўмоў Беларусі, намецілі рад конкрэтных мерапрыемстваў для стварэньня і ўзмацненьня соцыялістычнага сэктару ў галіне жывёлагадоўлі.

Выходзячы з пастановы ЦК і СНК Беларусі стада буйнай рагатай жывёлы павінна быць даведзена ў 1931 г. да 1.942.000 галоў, колькасьць сьвіней—да 2.710.000 гал. коняй—1.019.000. У 1932 г. гурт буйнай рагатай жывёлы павінен узрасьці да 2.322.000 галоў, сьвіней—да 3.800.000 штук, коняй—1.039.000.

Такая вялікая програма разгортваньня соцыялістычнай жывёлагадоўлі вымагае ад усёй партыйна-комсамольскай і профсаюзнай арганізацыі і ўсёй колгаснае масы напрудзіць усе сілы, вышукаць усе сродкі і мэтоды, каб поўнасьцю выканаць програму.

Комсамольская організацыя заўсёды была і будзе на перадавых вучастках будаўніцтва соцыялізму, заўжды перамагала там, куды яе клікала партыя. Комсамолія і зараз павінна рынуцца ў бой і заняць перадавыя позыцыі на фронце соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Асноўныя задачы, над якімі мы будзем цяпер біцца,— гэта капітальнае будаўніцтва саўгасаў, МТФ і СТФ, стварэньне моцнай кармовай базы, падрыхтоўка кадраў.

Сілос займае пачэснае месца ў кармовым балянсе. Комсамол шэфствуе над сілосам. На гэтым вучастку прарыў, які яшчэ не ліквідаваны. Нельга супакоіцца, пакуль не будзе выкапан плян сілосаваньня, пакуль мы не дамо 100 мільёнаў тон сілосу. Штурмавымі мерапрыемствамі (декада суботнік) мобілізуемся на безадкладнае і безагаворачнае выкананьне сілосных плянаў.

Комсамолія Беларусі, для выкананьня пастаноў усесаюзнай кооперацыйнай комсамольскай нарады, выступіла ў паход за збор адкідаў харчовай прамысловасьці, за збор адкідаў грамадзкага харчаваньня—гарбэджу. Гарадзкая комсамолія ў першую чаргу павінна ўключыцца ў праводзеньне паходу за гарбэдж, за будаўніцтва новых соцень дадатковых сьвінаадкормачных пунктаў, каб даць у канцы грамадзкага харчаваньня новыя тысячы тон сьвініны.

З 15-га чэрвеня на 15-е верасьня на падставе пастановы ЦК КП(б)Б праводзіцца ўдарны месячнік будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў. Комсамольская організацыя саўгасаў і колгасаў павінна безадкладна ўключыцца ў праводзеньне месячніка. Організуючы ўдарныя брыгады, соцспаборніцтва скончыць да 15 лістапада, згодна пастановы ЦК і СНК, будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў і пачаць комплектаваньне іх сьвіннымі і жывёльным пагалоўем.

З 1-га верасьня пачынаецца навучальны год, але ўкомплектаваньне сельска-гаспадарчых ВНУ і тэхнікумаў, у асаблівасьці жывёлагадоўчых, зрываецца. Гэтага дапусьціць мы не павінны. Райкомы і ячэйкі КСМ павінны выканаць дадзеныя ЦК разьвёрсткі ў гэтыя ВНУ і тэхнікумы.

Пастанова ЦК і СНК аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі зьяўляецца вялікай політычна-гаспадарчай задачай, над вырашэньнем якой будзе працаваць уся КП(б)Б і пад яе кіраўніцтвам комсамольская организацыя.

Бязьлітасна змагаючыся з усякімі перашкодамі, у першую чаргу з кулацтвам, правым і „левым“ опортунізмам, мобілізуючы шырокія масы працоўных, створым моцны падмурак для поўнага вырашэньня соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Азьвярэлыя судзьдзі рыхтуюць здабычу крывавым катам

Абрабаваных рабочых і сялян кідаюць на шматгадовую катаргу

Сярод мас беспрацоўных расьце імкненьне ў СССР

Расправа катаргай

ВІЛЬНЯ, 23. Фашысцкі тэрор супроць рэволюцыйных рабочых і сялян усё больш абвастраецца. Як паведамляе фашысцкая прэса, гэтымі днямі ў Лідзе адбыўся судовы процэс над рабочымі і сялянамі, якія былі арыштаваны зімою гэтага году і абвінавачваліся ў прыналежнасьці да КПЗБ. Такія абвінавачваньні былі прад'яўлены Гайку А, Кісялю С., Шымковічу І., Гашчанку А., Бартумскаму Я., Сондаку А., Зарэмбе В. і Цэпялевічу С. Ня гледзячы на тое, што ніхто зіх ня прызнаў прад'яўленыя ім абвінавачваньні, фашысцкі суд вынес катаржны прысуд. Гайку А. асудзіў на 6 год катаржных работ, Кіселя Шымковіча на 4 гады кожнага, Баргунскага на 2 гады і астатніх ад 1 да 2 год.

Расстрэл беспрацоўных, якія спрабавалі перайсьці ў СССР

ВІЛЬНЯ. 23. Масавае беспрацоўе, вялікае ўбоства і беднасьць сярод рабочых па ўсёй Польшчы кідае іх у стан роспачы. Побач з гэтым расьце рэволюцыйны рух і ўвага рабочых мас да Савецкага Саюзу, дзе няма ніводнага беспрацоўнага, дзе з кожным днём паляпшаецца матэр'яльнае становішча шырокіх працоўных мас. Як паведамляе фашысцкая „Газэта польска“, надняк некалькі дзесяткаў беспрацоўных, даведаўшыся аб тым, што ў СССР няма беспрацоўных і патрэбна рабочая сіла, організаваліся і спрабавалі нелегальным шляхам перайсьці ў СССР. У Дзісьненскім павеце напаткалі польскую пагранічную варту, якая загадала ім здацца. Беспрацоўныя не пайшлі на гэта. Тады моцны атрад польскай пагранічнай варты адкрыў па беспрацоўных страляніну, у выніку якое трое забіта і некалькі цяжка паранена. Арыштавана 22 чал.

Прысуд над двума рэволюцыйнымі вучнямі

ВІЛЬНЯ, 23. 20 чэрвеня ў Вільні адбыўся суд над былымі вучнямі Віленскай беларускай гімназіі: 19-гадовым Шыдлоўскім Аляксандрам і Відучынскім Я. Вучні абвінавачваліся ў прыналежнасьці да комсамолу. Фашысцкі суд прыгаварыў Шыдлоўскага А. на 5 год катаргі, Відучынскага Я. на 4 гады.

Бурная забастоўка краўцоў у Вільні

Вільня, 23. Забастоўкі абрабаваных працоўных, па меры далейшага пагоршаньня іх становішча, з кожным днём набываюць усё больш упарты і рэзкі характар. Аб гэтым прымушан заяўляць нават і фашысцкі друк. Як паведамляе фашысцкае „Слова“, абвешчаваная краўцамі ў горадзе Вільні забастоўка з прычыны зьверскай эксплёатацыі работадаўцаў працягвалася аж 7 тыдняў. Да забастоўкі далучыліся некалькі сот рабочых-краўцоў, якія патрабавалі 8-гадзіннага рабочага дня, павялічэньня зарплаты і палепшаньня іншых умоў працы.

Новыя масавыя звальненьні рабочых

Варшава, 23. Экономічны развал фашысцкае Польшчы з кожным днём узмацняецца.

Соцыял-фашысцкі „Работнік“ паведамляе, што гэтымі днямі ў Ожэны зачынілася шкляная гута, зволена некалькі сот рабочых. На фабрыцы цэманту ў Шчакаве з прычыны цяжкага фінансавага становішча зволена 280 рабочых. У Варшаве на прадпрыемствах „Філіпса“ некалькі тыдняў таму назад было зволена 20 проц. усіх служачых і ў апошні час зволена яшчэ 10 проц.

ТОЛЬКІ МАСАВАЯ РАБОТА І ІНДЫВІДУАЛЬНЫ АДБОР

Забясьпечаць рост комсамолу

У барацьбе за прамфінплян і рост колектыў „Кастрычніка" аслабаніўся ад „ордэна вярблюда", дадзенага „Ч. З.".

За апошні час мы маем некаторы зрух у росьце. Аднак, тэмпы росту ўсё яшчэ нездавальняючыя і не забясьпечваюць выкананьня баявой задачы—ператварэньня КСМ у шматмільённы. Прыклад „Кастрычніка" паказвае, што калі барацьбу за рост падпарадкаваць барацьбе за прамфінплян, можна дабіцца значных посьпехаў. У барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за пасьпяховую ўборку, на аснове індывідуальнага адбору рашуча змагаючыся з фактамі скажэньня лініі росту, мы павінны дабіцца павышэньня тэмпаў у росьце. Асноўная задача новаарганізаваных ячэек: барацьба за гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Комсамол Койданаўшчыны, перадавы на гаспадарчым фронце, не павінен адставаць у росьце

Койданаўскі раён зьяўляецца раёнам суцэльнай колектывізацыі. Адным з першых раёнаў Беларусі ён скончыў веснавую сяўбу. Зараз па-ўдарнаму праводзіць уборачную кампанію, за што атрымаў ад ЦК КП(б)Б пераходны сьцяг.

Не малую ролю ў барацьбе за пасьпяховае праведзеньне веснавой сяўбы і ўборачнай кампаніі адыграў комсамол Койданаўшчыны. Дрэнна аднак тое, што гэтай барацьбе на гаспадарчым фронце не падпарадкавана задача росту організацыі.

У раёне налічваецца 122 колгасы, а комсамольскія ячэйкі толькі ў 60 колгасах. Ячэйка колгасу „Новае жыцьцё", пры наяўнасьці больш 70 чал. моладзі, за ўвесь час прыняла ў комсамол аднаго чалавека. У саўгасе „Навасёлкі" 100 чалавек рабочае моладзі, з іх у комсамоле ўсяго 20 чалавек. Таксама зусім недапушчальна праводзіцца афармленьне ўступаючых. Анкеты маруджацца ў райкоме на 1—2 месяцы. Рад ячэек узорнай работай па ўмацаваньню колгасаў дабіўся сапраўдных тэмпаў у росьце, аднак ёсьць і факты пагоні за голай лічбай, адсутнасьць сталай работы па росту, прыём без індывідуальнага адбору. Напрыклад, ячэйка Негарэльскага сельсавету прыняла кулака. Сакратар колектыву колгасу „Комунар" Рубінштэйн дайшоў да таго, што выканаўчы разьвёрстку ячэйкам завербаваць па 20 чалавек. У выніку такой „вярбоўкі" набралі заможнікаў. Таксама слаба праводзіцца і замацаваньне навічкоў. Комсамольцы-навічкі ня ўцягнуты ва ўдарныя брыгады, сярод іх не вядзецца ніякай работы.

Ня гледзячы на нядрэнную работу раённага камітэту, усё-ж такі трэба адзначыць, што райком яшчэ дасканала не зразумеў новых задач, якія зараз паўстаюць перад організацыяй у зьвязку з тым, што раён стаў раёнам суцэльнай колектывізацыі. Мэтоды і формы работы засталіся па сутнасьці старымі. Зараз так нельга працаваць. Койданаўская організацыя павінна дабіцца яшчэ большых посьпехаў у справе аўладаньня колгаснай вытворчасьцю і павышэньня сваёй ролі ў кіраўніцтве і гаспадарчым замацаваньні колгасаў і ў барацьбе за гэта дабіцца організацыі комсамольскіх ячэек пры кожным колгасе.

Брыгадзір „Ч. З."
Эйдліна М.

У барацьбе за прамфінплян дабіліся посьпехаў у росьце

За слабую работу ў галіне росту колектыў фабрыкі „Кастрычнік" атрымаў ў ліпені ордэн вярблюда. Пасьля гэтага наш колектыў усю сваю ўвагу накіраваў на ліквідацыю прарыву ў прамфінпляне фабрыкі і ў барацьбе за гэта змагаўся за рост. Зараз колектыў налічвае 577 чал. Па-за комсамолам засталося ўсяго 56 чалавек. Фабрыка на 91 проц. акомсамолена Новыя ячэйкі і навічкі-комсамольцы зразумелі, што асноўнай задачай зьяўляецца выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, і ўсе сілы колектыву былі кінуты на гэта. Комсамольскія брыгады паказваюць прыклады баявой работы. Брыгада тав. Баркан пасьля акомсамоленьня выканала свой прамфінплян на 110 проц. Брыгада тав. Варкасава выканала прамфінплян на 113 проц. Брыгада тав. Кацілевіча на 120 проц. Зараз ставім мэту, каб к 17 МЮД'у даць яшчэ большыя паказчыкі ў выкананьні прамфінпляну нашай фабрыкі.

Бюро колектыву КСМ фабрыкі „Кастрычнік".

Ад рэдакцыі. *Дзякуючы посьпехам здабытку у выкананьні прамфінпляну і ў росьце, з колектыву зьнімаецца ордэн вэрблюда. Аднак, гэта ні ў якім разе не павінна супакойваць колектыў. Трэба памятаць, што на гэтым дарацьба ня скончана. Асноўная задача колектыву: далейшая барацьба за перавыкананьне прамфінпляну. У гэтай барацьбе вы павінны замацоўваць новых комсамольцаў. Ад сыстэмы паасобных посьпехаў паасобных дрыгад вы павінны перайсьці да сыстэмы посьпехаў у ўсёй рабоце. Акомсамоленая фабрыка не можа і не павінна мець прарываў у сваёй рабоце.*

Стаўка на самацёк давяла да гэтага

Комсамольская ячэйка саўгасу імя Будзённага і цэнтральнай бульбянай станцыі (Менск, прыгарадны р-н) зусім слаба змагаецца за рост. У ячэйцы усяго 10 чал., ня гледзячы на тое, што у саўгасе больш 50 чал. рабочай моладзі, якія актыўна змагаюцца за ўборку. Тут барацьбу за рост не ўмеюць падпарадкаваць барацьбе за гаспадарчыя задачы. Менскі гарком яшчэ мала ўвагі ўдзяляе вясковым ячэйкам, трэба рашуча ўдарыць па опортуністычнаму самацёку.

П. Шарафановіч.

Спыніць бязьдзейнасьць

На заводзе „Зьвязда" (Капцевічы) комсамольскі колектыў нічога не робіць па пытаньню росту. За апошні час колектыў зусім не расьце, хоць на заводзе вялікая колькасьць рабочае моладзі. Ніякай растлумачальнай масавай работы па пытаньню росту не праводзіцца. Колектыў наогул дрэнна працуе. Сакратар колектыву, тав. Авіцкі, зусім ніздабіна адносіцца да работы колектыву.

Райком КСМ таксама мала зьвяртае ўвагі на работу колектыву КСМ.

Гарбэнка.

ВАЙНА БЕЗГАСПАДАРНАСЬЦІ, БРУДУ І СЬМЕЦЬЦЮ

Сталоўкі павінны хутка рэалізаваць баявы загад партыі

„ЦК адзначае зусім нецярпімае становішча з санітарным станам раду прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня: наяўнасьць фактаў антысанітарнай апрацоўкі продуктаў, неахайнага мыцьця і абыходжаньня з пасудай, дрэннага захаваньня продуктаў, што вядзе да іх псаваньня, адсутнасьць санітарнага нагляду. (З пастановы ЦК УсеКП(б)

Перабудаваць працу

(Менск, фабрыка „Кастрычнік")

Ня гледзячы на тое, што ў сталоўцы фабрыкі „Кастрычнік" наглядаюцца якраз усе тыя недахопы аб якіх гаворыцца ў пастанове ЦК УсеКП(б)Б, (антысанітарыя, недахоп інвэнтара, абязьлічка ў рабоце і інш), да гэтага часу праўленьне ЗРК не распрацавала гэтай пастановы і ніякіх конкрэтных мер для яе ажыцьцяўленьня мабыць і ня думае прымаць. На сходзе абслугоўваючага пэрсоналу сталоўкі абгаварвалася пытаньне аб тым, як лепей забясьпечыць харчамі рабочых, але гэта абгаварэньне засталося словамі.

У сталоўцы штодзённа харчуюцца 2500 рабочых. Абсталяваньне надзвычай бепскае, Сталоўка ўяўляе сабою невялічкі цёмны барак, які знаходзіцца ў самым ганебным антысанітарным стане.

Сталоўка забясьпечваецца як па якасьці, так і па колькасьці добрымі прадуктамі, але прыгатаваньне гэтых продуктаў ўсё-ж такі дрэннай якасьці.

У сталоўцы пануе поўная абязьлічка.

Бэла.

Гэтымі днямі мы друкавалі пастанову ЦК УсеКП(б) аб палепшаньні грамадзкага харчаваньня.

Праз укараненьне гаспадарчага разрахунку, праз падрыхтоўку кадраў для сталовак, праз організацыю комсамольскіх паказальных сталовак комсамольская організацыя павінна дабіцца максымальна хуткага выкананьня пастановы ЦК УсеКП аб грамадзкім харчаваньні.



Памыйная яма пад вокнамі сталоўкі

Харчаваньне рабочых у сталоўцы Лепельскага спажыв. таварыства пастаўлена надзвычайна дрэнна.

Пры наяўнасьці вялікай колькасьці каштоўнейшых продуктаў, абеды падаюцца нікуды ня вартыя. Масла ляжыць да таго часу, пакуль не папсуецца. Пасьля выдаецца рабочым. Відэльцаў, нажоў, лыжак у сталоўцы ня знойдзеш.

Пад вокнамі сталоўкі—памыйная яма, сталы абціраюцца бруднымі анучамі, лыжкі і міскі ня мыюцца.

Паміж абслугоўваючым пэрсоналам сталоўкі не разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ня створаны ўмовы для іх працы.

Райком комсамолу павінен паслаць на работу ў сталоўку лепшых комсамольцаў і дабіцца практычнага ажыцьцяўленьня апошняй пастановы ЦК УсеКП(б) аб грамадзкім харчаваньні.

Зьм. Кузьмянок.

Машынай змагацца за лес


Вынаходзтва, якое дасьць тысячы

Вынаходзтва тав. Пякурына ў справе пагрузкі і выгрузкі лесу сябе апраўдала

Тав. Пякурын павінен быць прэміяваны

У нашай газеце ад 4-га чэрвеня было зьмешчана паведамленьне аб тым, што „Чырвоная Зьмена" бярэ шэфства над вынаходзтвам тав. Пякурына і над ўсёй яго рацыяналізатарскай дзейнасьцю.

Зьмяшчаючы акты спробы і адносіну Сожска-Дняпроўскае сплаўное канторы, рэдакцыя настойвае на неабходнасьці прэміяваць тав. Пякурына і хутчэй скарыстаць яго мэтад на ўсіх лесараспрацоўчых участках.



АКТ*)

1931 год 16 е жніўня

Мы, ніжэйпадпісаныя (пералічэньне прозьвішчаў) склалі гэты акт у тым, што за тэрмін з 13 па 16-га жніўня на прыстані Астраўкі быў праведзены вопыт пагрузкі лесу пляцоўкамі тав. Пякурына.

Вопыт пагрузкі дроў пляцоўкамі даў наступныя вынікі: група рабочых з сямі чалавек дзьвёма пляцоўкамі пагрузіла лайбу Лесбелу 70,0 кубамэтраў за чатыры гадзіны, тады, як пры значнай пагрузцы і посцы дроў на плячох і насілках за гэты тэрмін 7 чал. пагружаюць у сярэднім 28-30 кубамэтраў.

15 жніўня 10 чал. пагрузілі 103,0 кубамэтраў. На тую-ж лайбу аднычасова адбывалася пагрузка старым спосабам. 46 чал. з 6 коньмі пагрузілі 232,0 кубамэтраў. Такім чынам, першыя пагрузілі па 10,3 кубамэтраў на аднаго чалавека, а другія па 5,04 кубамэтраў на чалавека. Пагрузка дроў пляцоўкамі, як відаць з гэтага прыкладу, дае падвышэньне вытворчасьці на 100 проц.

Неабходна надалей практыкаваць гэты мэтод, чым можна дабіцца вялікіх посьпехаў.

6 подпісаў.

*) акт падаецца ў скарочаным выглядзе.

* * *

(З адносіны да сплаўнага аддзелу Лесбелу)


Сожска-Дняпроўская сплаўная кантора паведамляе, што пагрузка дроў і іншых дробных лесаматар'ялаў па мэтоду тав. Пякурына дала значныя вынікі. Пры пагрузцы барж на прыстанях Астроўкі дасягнуты мінімум 100 проц. павышэньне вытворчасьці працы.

Просім сплаўны аддзел шырока ўжыць гэты мэтод пагрузкі і выгрузкі, нарыхтаваўшы неабходную колькасьць такіх пляцовак і шарнірныя дарожкі да іх, бо гэты мэтод значна палягчае працу рабочых, павялічвае вытворчасьць яе, зьніжае сабекошт на 50 проц, павялічвае заработную плату і скарачае колькасьць неабходнай рабочай сілы.

Гомельскай сплаўной канторы патрабуецца пабудаваць такіх-жа пляцовак 20 комплектаў і да іх шарнірныя дарожкі.

Згодна пляну, за навігацыю неабходна перавезьці 320 тысяч кубамэтраў драўніны. Кошт пагрузкі пляцоўкамі 96 тысяч рублёў. Кошт абсталяваньня пляцовак на 20 прыстанях складзе 15 000 рублёў. Выходзячы з усяго гэтага, мэтод тав. Пякурына павінен даць 8. 500 р. экономіі.

Подпісы.



На здымках: зьверху—пагрузка і перавозка лесу па мэтоду Пякурына, зьлева ў авале—т. Пякурын. Зьнізу — пагрузка лесу па старому ручному мэтоду

Масы працоўных-рушыць у паход

На аснове шырокага разгорнутага соцспаборніцтва будзем змагацца за паўнацэнны прызыў!

Усебеларускі паход за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА праходзіць усё яшчэ марудным тэмпамі. Матар'ялы „чырвоназьменаўскага“ рэйду сьведчыць аб тым, што яшчэ ў радзе месц не разгорнуты гэты надзвычайнай важнасьці паход, не разгорнута баявой работы па выкананьню дырэктыў ЦК ЛКСМБ і ЦК УсеЛКСМ аб падрыхтоўцы да прызыву 1909 г.

Патрэбна неадкладна выканаць дырэктыву ЦК УсеЛКСМ, які прапанаваў „неадкладна ўзмацніць удзел у падрыхтоўцы і правядзеньні прызыву РСЧА моладзі 1909 г. нараджэньня. На паседжаньнях бюро камітэтаў, бюро і агульных сходах ячэек абгаварыць ход падрыхтоўкі да прызыву і вызначыць практычныя мерапрыемствы па ўзмацненьню ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньні прызыву“.

Камсамольскія організацыі павінны асаблівую ўвагу аддаць выкананьню дырэктывы ЦК УсеЛКСМ аб тым, каб „усю падрыхтоўку к прызыву разгарнуць на аснове спаборніцтва, на аснове яшчэ большага ўмацаваньня сувязі шырокіх мас працоўных і асабліва комсамолу з Чырвонай арміяй“.



Яны будуць чырвонафлётцамі

„Большевистский молодняк“

нарэшце адказаў „Чырвоназьменаўцам“

„Чаму маўчыць „Большевистский молодняк“?

Пад такім загалоўкам штодзённая газэта Рэввоенсавету БВА „Красноармейская Правда“ у № 182 піша:

„У органе ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена“ і ў нашай газэце быў зьмешчаны выклік „Чырвонай Зьмены“ на соцспаборніцтва ў барацьбе за лепшую падрыхтоўку да прызыву рашаючага году пяцігодкі, адрасаваны да комсамольскай газэты заходняй вобласьці „Большевистский Молодняк“. З таго часу прайшоў месяц. Рэдакцыя „Большевистского Молодняка“ не адгукнулася на выклік.

У той час, як „Чырвоная Зьмена“ разам з газэтамі „Красноармейская Правда“ і „Чырвонаармейская Праўда“ уключыліся ў рэйд „Красной Звезды“ па праверцы гатоўнасьці да прызыву, „Большевистский Молодняк“ толькі ад выпадку да выпадку зьмяшчае невялікія заметкі аб прызыве.

Як расцэньваць гэтае маўчаньне органа Заходняга абласнога камітэту ЛКСМ у адносінах да важнейшай галіны абароннай работы? Толькі, як недапушчальнае гарэбліваньне барацьбы за поўнацэнны прызыў, як вялікую палітычную памылку гэтай газэты.

Даводзячы аб гэтым да ведама шырокай грамадзкасьці, мы патрабуем ад Захабкому УсеЛКСМ неадкладнага рэагаваньня на опортуністычныя адносіны „Большевистского Молодняка“ да пытаньняў падрыхтоўкі к прызыву“.

„Большевистский Молодняк“ у № 189, пасьля неаднаразовых напамінкаў з боку „Чырвонай Зьмены“, а таксама пасьля вышэйпададзенага рэдакцыйнага артыкулу ў „Красноармейской Правде“ зьмяшчае на сваіх старонках наступныя радкі.

„Газэтай беларускага комсамолу „Чырвонай Зьменай“ кінуты выклік „Большевистскому Молодняку“ на лепшае правядзеньне падрыхтоўкі да прызыву ў РСЧА.“

Рэдакцыя „Б. М.“ прызнае дапушчанае з яе боку прамаруджаньне з адказам на выклік „ЧЗ“:

„Удзел і роля газэты („БМ“ рэд.) у падрыхтоўцы к прызыву да гэтага часу ўсё яшчэ зьяўляюцца нездавальняючымі.

Мы ўступілі ў адказны этап падрыхтоўкі. Тэрміны да пачатку прызыва кароткія. У гэтых умовах прымаючы выклік „Чырвонай Зьмены“, „Большевистский Молодняк“ прымае на сябе абавязак выправіць свае недахопы, павысіць свой удзел у падрыхтоўцы прызыву. У прыватнасьці бліжэйшым мерапрыемствам, організуемым рэдакцыяй зьявіцца ўсеабласны рэйд брыгад „БМ“ па праверцы ходу клясавага адбору прызыўнікоў на мясцох, ходу ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызываемых, пастаноўкі работы сярод прызыўнікоў“.

Нарэшце чытачы „Чырвонай Зьмены“, такім чынам, маюць магчымасьць даведацца аб тым, што „Большевистский Молодняк“ прыняў наш выклік на соцспаборніцтва ў барацьбе за клясава-сьвядомы і пісьменны прызыў.

Разам з тым мы лічым патрэбным адзначыць што роля „БМ“ ні ў якім выпадку не павінна абмежавацца правядзеньнем усеабласнога рэйду. Напамінаем таксама, што „БМ“ павінен форсаваць тэмпы сваёй работы, што за нашым соцспаборніцтвам ужо больш месяцу сочыць арбітр наш—Рэввоенсавет БВА, а таксама комсамолія БССР і Заходняй вобласьці.

„Чырвоназьменаўцы даносяць“

Жлобінцы ганьбяць наш паход

ЖЛОБІН. Да прызыву ніякай падрыхтоўкі не вядуць Жлобінскі райнарасьветы і РК ЛКСМБ.

У раёне 44 няпісьменных прызыўнікоў. Яны не ліквідуюць сваю няпісьменнасьць таму, што Жлобінскі РК ЛКСМБ і інспэктарыят Нарасьветы опортуністычна аднесьліся да задач прызыву.

Загадчык аддзелу нарасьветы разважае: „У нас усе настаўнікі ў адпачынку, няма каму займацца ліквідацыяй няпісьменнасьці“. РК ЛКСМБ нічога не зрабіў для таго, каб выканаць дырэктывы ЦК аб правядзеньні паходу.

У Нова-Марковіцкім, Стрэшынскім, Добраагашчанскім, Салонскім сельсаветах ні комсамольскімі ячэйкамі, ні грамадзкімі організацыямі ні кай работы па прызыву не вядзецца.

Р. М.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя „Ч. З.“ абурана такім станам „работы“ па падрыхтоўцы прызыву ў Жлобінскім р-не. Папярэджваем Жлобінскі РК ЛКСМБ аб тым, што калі на працягу бліжэйшай пяцідзёнкі ня будзе дасягнута зруху ў паходзе за клясава-сьвядомы і пісьменны прызыў, дык „Чырвоная Зьмена“ вымушана будзе занесьці Жлобінскую комсамолію на чале з яе кіраўніцтвам на чорную дошку і патрабаваць перад ЦК ЛКСМБ прыцягненьня Жлобінскага РК ЛКСМБ да суровай адказнасьці.

Конвэер бязьдзейнасьці—ліквідаваць

Паход за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА не закрануў комсамолію і ўсю пролетарскую грамадзкасьць Вылрэйскага сельсавету (Лёзьненшчына).

Тут не праведзена ніякай растлумачальнай работы сярод працоўнага насельніцтва і прызыўнікоў аб задачах паходу. Сельсавет не лічыць патрэбным займацца справай прызыву.

Юнкор „ЧЗ“ П Хадарэнка

У Чырвоную ідзем пісьменнымі

У Клічаўскім раёне ў часе разгортваньня паходу за клясава-сьвядомы і пісьменны прызыў выявілася, што 14 прызыўнікоў няпісьменна. Да гэтага часу ліквідавана няпісьменнасьць 12 чалавек.

М. Стальны.

Шырэй разгарнуць работу

Паход увязаць з падрыхтоўкай да МЮД'у

У Дрысенскім р-не падрыхтоўка да прызыву распачалася яшчэ ў пачатку года. У сакавіку месяцы пры РВК была складзена камісія па сацзабесьпячэньню падрыхтоўкі да прызыву.

Райваенкаматам і райкомам ЛКСМБ была склікана раённая конфэрэнцыя прызыўнікоў, дзе былі абгавораны пытаньні падрыхтоўкі да прызыву. На сельскіх сходах і групах беднаты ўсе прызыўнікі абгавораны.

У раёне налічваецца 5 няпісьменных прызыўнікоў і 36 малапісьменных. Дзякуючы захадам, якія былі ўжыты РК ЛКСМБ і інспэктарам асьветы ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці прызыўнікоў у раёне будзе скончана ў тэрмін.

Паміж РК КСМ і райваенкаматам ўсё яшчэ няма ўвязкі ў падрыхтоўцы да прызыву. Праводзімая работа па прызыву ў комсамольскіх ячэйках не ўвязваецца з усёй падрыхтоўкай да 17 МЮД'у.

Райком ЛКСМБ павінен ужыць захады да яшчэ большага разгортваньня паходу. Патрэбна работу па прызыву падначаліць асноўным гаспадарча-палітычным задачам нашай краіны.

Выязная рэдакцыя „ЧЗ“ Казлоў, Канончык

Пасьля сыгналаў „ЧЗ“

Гомельскі галаўны разгортвае работу

Ударныя брыгады „чырвоназьменаўцаў“ Гомелю на старонках „Ч. З.“ гэтымі днямі пісалі: Гомельскі галаўны „састае“, яе здзявалі пра паход за клясава-сьвядомы і пісьменны прызыў—Гомельскім галаўным атрадам.

Гомельскі гарком ЛКСМБ паведамляе рэдакцыю аб ужытых ім захадах у выніку сыгналаў „Ч. З.“ і баявой падрыхтоўкі да прызыву, адзначаных „Чырвонай Зьменай“.

На бюро гаркому ЛКСМБ былі заслуханы даклады сакратароў комсамольскіх калектываў аб ходзе падрыхтоўкі да прызыву.


Бюро ГК таксама канстатавала „зусім слабы рост комсамолу за кошт прызыўнікоў“ і адзначыла самацёк у правядзеньні гэтай работы.

Бюро ГК ужыла рашучыя захады да тых, хто ня выконвае ўскладзеных абавязкаў па разгортваньню паходу за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА. Бюро ГК паставіла „За невыкананьне дырэктыў“ абвясьціць вымову сакратарам калектыву Сельмашу, „Комінтэрн“, „Праца“, электрастанцыі, шчаціннай фабрыкі, Белдзяржбуду, 9-ы вучастку шаг, элеватару.

Папанаваць усім комсамольскім ячэйкам і калектывам не пазьней, як праз 3 дні паведаміць ГК аб праробленай рабоце, адначасова забясьпечыць поўнае асьвятленьне ходу падрыхтоўкі да прызыву ў „Чырвонай Зьмене“ і „Палескай Праўдзе“.

Гомельскі ГК ЛКСМБ ужыты шэраг іншых захадаў для забясьпечаньня пасьпяховага правядзеньня паходу.

Будзем гатовы стаць падружжо!



У Баўманскім ваенна-вучэбным пункце комсамольцы-прызыўнікі спаборнічаюць за хуткасьць разбору вінтоўкі

Даць кадры для кадраў

Забясьпечыць школы і тэхнікумы настаўнікамі, укомплектаваць усе навучальныя ўстановы

Дзень за днём скарачаецца тэрмін да пачатку навучальнага году. Ужо засталося 7 дзён да пачатку заняткаў. Але, як бачым са зьмешчанага сёньня матар'ялу, забясьпечаньне школ настаўнікамі і укомплектаваньне навучальных устаноў ня паграмажэна ўсюды.

У Касьцюковіцкім раёне, замест дапамогі настаўніку ў яго рабоце, складаюць для яго недахопы зновы,—члены Студзянецкага сельсавету перашкаджаюць рабоце настаўнікаў.

Пэдкурсы Слуцкага пэдтэхнікуму і першага курсу тэхнікуму не забясьпечаны людзьмі: на 320 вакансій пададзена толькі 150 заяў. Тэхнікум не забясьпечаны выкладчыкамі грамадазнаўства.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што некаторыя раёны дрэнна рыхтуюцца да сустрэчы навучальнага.

Час не чакае. Гэтыя 7 дзён неабходна скарыстаць на тое, каб забясьпечыць усе школы і тэхнікумы настаўнікамі, падручнікамі і неабходным абсталяваньнем.

Першага верасьня заняткі павінны пачацца!

Больш увагі завочнаму навучаньню

Шпаркі тэмп разгортваньня нашай прамысловасьці патрабуе найвялікшай увагі да пытаньня падрыхтоўкі кадраў. Існуючыя навучальныя ўстановы бязумоўна ня здолеюць даць нам такую колькасьць кадраў, якая нам зараз патрэбна. Акрамя таго ў сучасны момант немагчыма зьняць з вытворчасьці вялікую колькасьць рабочых для іх падрыхтоўкі.

Вялікім дапаможнікам у сэнсе падрыхтоўкі кадраў зьяўляюцца завочнае навучаньне, якое дае магчымасьць ня зьнімаючы людзей з вытворчасьці даць ім належную адукацыю.

ВСНГ БССР пачаў завочнае навучаньне пры:

Мэханічна-машынабудаўнічым Інстытуце ў Гомелі,

Будаўнічым Тэхнікуме ў Менску,

Політэхнікуме ў Віцебску,

Тарфяным аддзяленьні Хэміка-Тэхнолёгічнага Тэхнікуму ў Менску.

З 1932 году завочнае навучаньне будзе разгорнута пры ўсіх існуючых стацыянарных навучальных установах, падпарадкаваных ВСНГ БССР.

Нягледзячы на важнасьць завочнага навучаньня, да гэтага часу гэтаму пытаньню ўдзелена вельмі мала ўвагі. Парт'ячэйкі на мясцох, ячэйкі ЛКСМ, профэсыйныя організацыі амаль нічога не зрабілі ў сэнсе растлумачэньня значэньня завочнага навучаньня.

На заводзе імя Варашылава ня вераць у завочнае навучаньне і з гэтае прычыны нічога ня робяць. На ф-цы імя Дзяржынскага ў Бабруйску матар'ялы па завочнаму навучаньню падшыты да справы фабкому, ніхто аб іх няведае, нават ніхто ня ведае як яны папалі ў справу.

Дзякуючы гэткім адносінам прыток слухачоў у завочныя навучальныя ўстановы вельмі і вельмі нязначны.

Справе завочнага навучаньня патрэбна сталая дапамога, як у сэнсе растлумачэньня значэньня яго для нас, так і сэнсе вярбоўкі слухачоў.

Задача комсамолу—павярнуцца тварам да завочнага навучаньня.

Д.



Спыніць зьдзекі

Вельмі дрэнна адносяцца у Студзянецкім сельсавеце Касьцюковіцкага раёну да настаўнікаў. Сельсавет лічыць іх за тэх. працаўнікоў і па тры месяцы ня выплачвае пэнсіі. Чаму ня выплачваеце пэнсію?—пытаюць настаўнікі.

—„Выкачайце запазычанасьць, тады мы з вамі разьлічымся“,—адказвае сельсавет.

Вельмі часта можна пачуць, як некаторыя працаўнікі сельсавету абзываюць настаўнікаў шкоднікамі і контррэволюцыянэрамі.

Настаўніка Ларчанку, які працаваў увесь Студзянцы 14 год і організаваў 4 колгасы, сельсавет перакідвае ў іншае месца за тое нібы Ларчанка „не карыстаецца аўтарытэтам“.

Бурдзель

Ад рэдакцыі: Мы патрабуем ад Касьцюковіцкай Рай РСІ прыняць тэрміновыя захады да тых, хто беспадстаўна перакідвае настаўнікаў з аднаго месца на другое, хто перашкаджае настаўніцтву працаваць.

Ліквідаваць прары!

У Слуцкім пэдтэхнікуме надзвычай дрэнна абстаіць пытаньне з кадрамі. Своечасовы пачатак навучаньня—пад рэальнай пагрозай зрыву. На 320 месц падана толькі 150 заяў.

Халатныя адносіны адміністрацыі і партыйна-комсамольскага колектываў тэхнікуму да вярбоўкі—вось прычына пагрозы.

Яшчэ і па сёньня ня прыступлена да рамонту інтэрнату, не абсталяваны габінэты, не закуплена неабходная мэбля і г. д. Не хапае настаўнікаў па грамадазнаўству.

Задача Слуцкага РК ЛКСМБ: конкрэтна дапамагчы тэхнікуму.

Брыгадзір „ЧЗ“ Новік Янка.

Сацыялістычнай жывёлагадоўлі—ударныя тэмпы разьвіцьця

РАБОТУ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ ЦЭХАЎ—ПАД ПІЛЬНЫ КОМСАМОЛЬСКІ НАГЛЯД

Комсамольскія ячэйкі колгасаў „Пераможца“ і „Чырв. Кастрычнік“ працуюць па-абломаўску

Комсамолія „Чырвонага Кастрычніка“,—адказвай!

Колгас „Чырвоны Кастрычнік“, Хаюкоўскага сельсавету, Крупскага раёну, яшчэ летась распачаў будаўніцтва сьвінарніка на 300 галоў. Тэрмін заканчэньня, пабудовы—першае Кастрычніка 1930 году. Аднак праўленьне колгасу не клапоціцца канчаць сьвінарнік.

Комсамольская ячэйка колгасу бязьдзейнічае не зьвяртае ніякай увагі на зрыў будаўніцтва сьвінарніка, як быццам не ячэйкі гэта справа.

Сьвінарнік павінен быць пабудаваным. Сьвіньні не павінны быць у брудным догладзе.

Комсамольская ячэйка колгасу павінна безадкладна паправіцца за жывёлагадоўчае будаўніцтва.

Алексейчык Ян.

Не пашыраюць, а зьмяншаюць стада

Рага эў.—Згодна пастановы агульнага сходу, стада буйнай рагатай жывёлы у колгасе „Пераможац“, Гадзілаўскага сельсавету, трэба было павялічыць на 50 проц. Дзякуючы нядбайным адносінам праўленьня колгасу да выкананьня пастановы партыі і ўраду аб разьвіцьці жывёлагадоўлі, стада кароў не толькі не павялічана, а зьменшана, у параўнаньні з мінулым годам.

Цялят і ўся жывёла даглядаецца вельмі дрэнна.

Неабходна зараз-жа палепшыць догляд жывёлы, прыступіць да практычнага ажыцьцяўленьня адозвы ЦК і СНК аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Сым. Семянцоў

Распрацоўка адозвы праходзіць слаба

Адозва ЦК УсеКП і СНК СССР аб разгортваньні жывёлагадоўлі да гэтага часу не даведзена да кожнага колгасьніка, бедняка і серадняка. Райколгасаюз і РК КСМ бязьдзейнічаюць.

Прапрацоўка адозвы ў Перадоўскім сельсавеце паказала, што колгасьнікі і аднаасобнікі вельмі зацікаўлены гэтым пытаньнем.

Патрэбна зрабіць рашучы пералом у справе прапрацоўкі адозвы. Адозва ЦК і СНК павінна быць даведзена да кожнага колгасьніка серадняка і бедняка.

Брыгадзір „Ч 3“ Забава.

Спыніць зьнішчэньне маладняка

Жывёлагадоўля ў колгасе „Ніва Кастрычнік“, Дваранскага сельсавету, Рагачоўскага раёну, пастаўлена ўсім дрэнна. Асабліва бездаклядна колгас адносіцца да гадоўлі маладняка.

У колгасе 100 кароў. Цялят гадуецца толькі 25, большасьць цялят выразана на мяса. Цялят зьнішчалі і паасобныя члены колгасу, кароны якіх не абагулены.

Маладняк значэньня зьнішчаецца ў той час, калі пастанова партыі і ўраду катэгорычна прапануе спыніць забой маладняка і прыняць усе меры для разгортваньня жывёлагадоўлі.

Сымон Бялінка.

Змагацца за 23 і 4

Стара-Дарожскі р-н мае жывёлагадоўчы ўхіл. Колгасы раёну прыступілі да распрацоўкі адозвы ЦК УсеКП і СНК СССР аб разгортваньні жывёлагадоўлі, але практычна не ажыцьцяўляюць.

Па пляну, райколгасаюз павінен сёлета пабудаваць 23 сьвінагадоўчы і 4 малочныя фэрмы на 2300 сьвінаматак і 500 кароў. На сёньня сьвінаводныя гаспадаркі укомплектаваны сьвінаматкамі толькі на 415 шт. у той час як укомплектаваньне павінна быць закончана да 1-га жніўня.

Да будаўніцтва сьвінарнікаў прыступілі толькі 7 колгасаў. Колгасы „Герой працы“, „Чырвоная горка“, „Май“ і інш. значыльна бязьдзейнічаюць у справе пабудовы сьвінарнікаў, хоць яны поўнасьцю забясьпечаны будаўнічымі матар'ямі.

РК КСМ павінен распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы і наладзіць сыстэматычны кантроль над іх выкананьнем.

Мікола Мацько

Прыклад колгасу „Сьвет“—усім колгасам

Бабруйскі Колгасьнікі „Сьвету“ у адказ на пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб жывёлагадоўлі прынялі на сябе рад абавязацельстваў і высунулі сустрэчны плян камплектаваньня сьвінагадоўчае фэрмы і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве, які на 26 проц. перавышае заданьне.

На аснове пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, колгасьнікі прыступілі да лепшага наладжваньня догляду жывёлы, вылучыўшы адказнага члена праўленьня за сьвінагадоўчую фэрму і абавязаліся ахапіць соцспаборніцтвам колгасьнікаў, якія працуюць у галіне жывёлагадоўлі. Колгас выклікаў на соцспаборніцтва сьвінагадоўчую фэрму „Чырвоны працаўнік“.

Рыхтуемся да будаўнічай нарады 28-га жніўня ў рэдакц. „Чырв. Зьмены“

Працягваем завочную падрыхтоўчую нараду

Наступнае слова мае будаўнік тав. Фішкін і брыгада: Апэльбаум і Марголін

* * *

— На 2-ой Даўгабродзкай вуліцы быў адведзены ўчастак для будаўніцтва стандартнага дому Саўнаркому. Было прывезена 5 вагонаў лесаматэр'ялу. Праз нейкі час атрымалася пісульжа, каб гэтыя матар'ялы ўбраць з вучастку, бо ён варочаецца былому гаспадару яго някаму Турэцкаму.

Для дому быў заведзены новы ўчастак, каля казармы, куды перавезьлі матар'ял, дзе зноў убралі яго адтуль, склаўшы на складзе ЖАКТу, адкуль прыбыў першы галаваломскі загал.

Гэтым непатрэбным перавозкам час ужо паклаісьці канец.

Не выкідайце золата на вецер

— Зараз будаўніцтва ў самым разгары. Мы будуем новыя фабрыкі, заводы, рабочыя кватэры, клюбы і навучальныя ўстановы. Але нам часам не хапае для будоўлі неабходных матар'ялаў. Як-жа мы выкарыстоўваем тыя матар'ялы, якія ў нас ёсьць?

Надзвычай дрэнна, таварышы. Я хачу прывесьці адзін прыклад.

На працягу трох-чатырох тыдняў на вуліцы Энгельса каля клюбу саўгандальслужачых валялася тры скрыні з вапнай, якая пасьля доўгага ляжаньня на вуліцы акамянела і сапсавалася. Зусім недалёка ад гэтых скрынь я сабраў звыш трох пудоў портляндзкага цэманту, расыпанага пабруку і ў канаве.

---

25 жніўня, а 6 гадзіне ўвечары	У памяшканьні рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“	25 жніўня, а 6 гадзіне ўвечары

адбудзецца пасяджэньне штабу па збору макулатуры

павінны зьявіцца: т. Маеўскі ЦБ ДКО, Быкаўскі ЦК ЛКСМБ, Шнікэр „Піонэр Беларусі“, Папоў, Руваў Бэлкоопутыль, Ханін Белполіграф, Ауг, Перэльман Саюзпапера, Бабушкін, Балынскі Белутыль, Мільток, друкарня імя Сталіна, Гімельштэйн Сампрамсаюз, Соркін Белмалжывёлсаюз, прадстаўнікі гаркому ЛКСМБ, гарбюро ДКО, гарсавету і рэдакцый газэт: „Зьвязда“. „Савецкая Беларусь“, „Рабочий“ і „Колгасьнік Беларусі“.

Штаб.

Юнкорыя Менску

Агульна-гарадзкі зьлёт юнкораў-ударнікаў па пытаньню:

„Прамова т. Сталіна і задачы друку“

адбудзецца 24-га жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“ (Карла Маркса, 38)

Усе—на зьлёт!

Да 17-га МЮД'у

* У падарунак 17-га МЮД'у 7 чал. датэрмінова канчаюць організаваныя на ф-цы „Кастрычнік“ курсы мэханікаў. 25 лепшых комсамольцаў у тым ліку і комсамольцаў-навічкоў колектыў накіраваў на працу ў ТНБ.

* 2 комуны ф-кі „Беларуска“ пераведзены на гаспадарчы разрахунак. 20 жніўня на зьлёце ўдарнікі ф-кі заслухалі вынікі пераводу. Створаны 2 плянава-опэрацыйныя групы.

* На .00 проц. акомсамоленай прыходзіць да 17-га МЮД'у менская рымарная ф-ка. Праводзіцца праца па замацаваньню росту. Гурткі навічкоў прапрацоўваюць політмінімум. Колектыў займаецца працай па ахопу комсамолам новай рабочай моладзі, якая паступае на фабрыку.

* Кожная цэх'ячэйка з-ду „Варашылава“ ў падарунак 17-му МЮД'у дае на 20 рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходзтваў.

* У рабочым пакоі 20 ФЗС к-тыў ЛКСМБ з-ду „Варашылава“ ўстанавіў сьвідравальны варштат для політэхнізацыі падшэфнай школы.

* 20 жніўня к-у ЛКСМБ ф-кі „Гэрой працы“ (Добруш) наладзіў радыёпераклічку цэхаў ф-кі па выкананьню пастановы бюро аб падрыхтоўцы да 17-га МЮД'у.

* Па прыкладу брыгады імя 10-га зьезду ЛКСМБ ф-кі імя Крупскай (Шчотачная), на гаспадарчы разрахунак перайшоў увесь цэх.

Шляхі разгортваньня соцыялістычнай жывёлагадоўлі

Пытаньні разгортваньня соцыялістычнай жывёлагадоўлі ў сучасны момант набылі асабліва актуальнае значэньне. Радам рашэньняў партыі і ўраду ўжо вызначаны конкрэтныя мерапрыемствы для ўзмацненьня разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Зараз партыяй пастаўлена ў парадак дня баявая задача:—у найкарацейшы тэрмін вырашыць проблему жывёлагадоўлі, проблему забясьпечаньня краіны мяса-малочнымі продуктамі, а прамысловасьці жывёлагадоўчай сыравінай.

Партыя ўжо прыступіла да вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы.

У першую чаргу намечана разьвязаць кармовае пытаньне, бо зусім ясна, што хуткае і пасьпяховае вырашэньне жывёлагадоўлі знаходзіцца ў простай залежнасьці ад ня менш хуткага і пасьпяховага разьвіцьця кармовае базы.

У чым-жа прычыны нашых мясных цяжкасьцяй, якімі шляхамі можна іх зьнішчыць?

Зьніжэньне пагалоўя жывёлы за апошнія гады тлумачыцца радам прычын, у тым ліку і недародам кормаў у паасобных раёнах. Галоўная-ж прычына зьніжэньня пагалоўя мясьціцца аднак у абвостраньні клясавай барацьбы на вёсцы, у сувязі з разгорнутым наступленьнем соцыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя.

Кулацтва, пацярпеўшы паражэньне на хлебазагатоўчым фронце пачала ўзмоцнена зьнішчаць стада. Яно здолела пацягнуць за сабой і паасобныя, менш устойлівыя, пласты серадняцкага сялянства, выкарыстоўваючы перагібы некаторых організацый у колектывізацыі.

Саўгасы і колгасы вырашаць мясную проблему

Саўгасы і колгасы, якія ў той час (1929-30 г) адыгрывалі яшчэ зусім нязначную ролю ў жывёлагадоўлі, не маглі адразу і цалкам замяніць кулацка-заможніцкай жывёлагадоўлі. Агульнае зьніжэньне пагалоўя жывёлы, вядома, зьнізіла і яго таварнасьць.

У выніку мы сустрэліся з абвасрыўшыміся мяснымі цяжкасьцямі, як простым вынікам асаблівага адставаньня нашай жывёлагадоўлі ад агульных тэмпаў усяго соцыялістычнага будаўніцтва і ў першую чаргу індустрыялізацыі.

Да апошняга часу мэтад вядзеньня нашай жывёлагадоўчай гаспадаркі заставаўся фактычна дробна—саматужным—у сваёй аснове бядняцка-серадняцкім.

Дробная аднаасобная гаспадарка ня толькі ня ўсілах сколькі-небудзь значна павялічыць таварнасьць жывёлагадоўлі, але і стварыць лепшыя найбольш хуткасьпелыя, найбольш мясныя пароды жывёлы

Няўстойлівасьць і экономічная неналзейнасьць дробнай і дробна-таварнай жывёлагадоўчай гаспадаркі паставілі з усёй вастратой проблему жывёлагадоўлі і прымушаюць яе вырашаць на шляхох буйнай аграмаджанай гаспадаркі, праз організацыю сеткі саўгасаў і колгасаў,—апорных пунктаў нашай політыкі і экономічна больш устойлівых.

Аграмаджаная жывлагадоўля (саўгасныя і колгасныя таварныя фэрмы), не гледзячы на зусім кароткі тэрмін свайго існаваньня, ужо складае значны гурт і заняла значнае месца ў забясьпечаньні дзяржавы мяса-малочнымі продуктамі.

Буйнай рагатай жывёлы зараз па саўгасах і колгасах БССР налічваецца 127 тыс. штук, сьвіней 123тысячы штук. На 1-е жніўня малочным саўгасамі і малочна-колгаснымі таварнымі фэрмамі здадзена дзяржаве 253,140 цэнт. малака. Такім чынам, таварнасьць жывёлагадоўчых таварных фэрм і саўгасаў складае каля 65 проц.

Аднак. дасягнутыя посьпехі ў галіне жывёлагадоўлі ў саўгасах і жывёлагадоўчых колгасных фэрмах яшчэ зусім недастатковыя і не забясьпечваюць выкананьня пастаўленых XVI зьездам УсеКП(б) і XIII зьездам КП(б)Б задач у галіне жывёлагадоўлі.

Раённыя партыйныя організацыі, РВК, дырэктары саўгасаў і кіраўнікі колгасаў не паставілі яшчэ ў цэнтр увагі сваёй работы барацьбу за разгортваньне жывёлагадоўлі, яны не дабіліся да гэтага часу стварэньнея кармовай базы, як асновы для пасьпяховага разгортваньня жывёлагадоўлі.

У значнай частцы саўгасаў і колгасаў дрэнна пастаўлены догляд і не захаваны санітарныя ўмовы ўтрыманьня жывёлы, назіраецца безгаспадарчасьць, недапушчальна высокі процант падзяжу жывёлы, у асаблівасьці сьвіней, адставаньне ва ўкомплектаваньні стада за лік аграмаджаньня па лініі малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм і па лініі ўкомплектаваньня саюзмяса за лік загатовак, нездавальняючае выкананьне пляну будаўніцтва па жывёлагадоўлі.

Усе гэтыя моманты зьяўляюцца тормазамі ў выкананьні прынятай ЦК і СНК програмы разгортваньня жывёлагадоўлі ў соцыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

З прычыны гэтага, ЦК КП(б)Б і СНК БССР, у выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б)Б і СНК СССР аб стварэньні і ўзмацненьні соцыялістычнага сэктару ў галіне жывёлагадоўлі ў саўгасах і колгасна-таварных фэрмах, паставіў гэтае важнейшае, вялікага экономічна-політычнага значэньня пытаньне—цэнтральнай задачаю ўсёй КП(б)Б

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй апошняй пастанове абавязалі ўсе РК КП(б)Б, РВК, трэсты і цэнтры колгасных таварных фэрм прыняць усе меры да стварэньня ў 1931 годзе цьвёрдага фундаманту для далейшага шпаркага разьвіцьця соцыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі з тым, каб і ў гэтай апошняй, пакуль яшчэ слаба аграмаджанай галіне сельскай гаспадарчай вытворчасьці, дабіцца сапраўднай перамогі, заснаванай на апошніх дасягненьнях навукі і тэхнікі.

Роля ленінскага двойчы чырвонаштандарнага комсамолу, які зьяўляецца шэфам сілосу і жывёлагадоўлі, у барацьбе за соцыялістычную жывёлагадоўлю за мяса, зьяўляецца перадавой і асабліва адказнаю роляй.

Чырвонаштандарны павінен быць у першых радох барацьбітоў за разгортваньне соцыялістычнай жывёлагадоўлі, ён абавязан па-ўдарнаму змагацца і—на аснове сваёй асаблівай энэргічнасьці і працы па-новаму перамагчы.

Віт. Сідарук.

Паведамленьне

21-га жніўня ў памяшканьні Белдзярж тэатру а 4-й гадзіне адбудзецца нарада ўсіх тэатральных установ г. Менску па пытаньню мастацкага абслугоўваньня к 17 МЮД'у.

На нараду павінны абавязкова зьявіцца: культсэктары МК—тэатру Кумельскага, музкомэдыі, цырку, а таксама прадстаўнікі УВП (Савенкаў) ДАМЭЦ'у (Гурвіч), „Чырвонай Зьмены“, БелТРАМ'у ЯЎТРАМ'у.

Мастацкая МЮД'аўская камісія Менгаркому ЛКСМБ.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599